белорусского народов постепенно слабеет. В эволюции представлений белорусов о россиянах и россиян о белорусах определённую негативную роль сыграли так называемые газовые, молочные, сахарные «войны», однобокие, тенденциозные, политизированные оценки, распространяемые средствами массовой информации. В нынешнем приграничном сотрудничестве Беларуси и России, конечно, первостепенную важность имеют торгово-экономические цели, однако ни в коем случае нельзя преуменьшать значение гуманитарного сотрудничества, способствующего благоприятному имиджу сотрудничающих народов и субъектов хозяйственно-экономической деятельности.


1. Пастернак, Т. Круг экспортеров еще узок / Т. Пастернак // Народнае слова. – 2011. – 26 марта.
2. Манаков, А.Г. Влияние пограничного положения Псковской области на социокультурные ориентиры населения региона / А.Г. Манаков // Балтийский регион. – 2010. – № 2. – С. 112 – 121.
3. Сикевич, З.В. Русские, украинцы, белорусы: вместе или врозь? / З.В. Сикевич // Социологические исследования. – 2007. – № 9. – С. 59–69.
4. Кузнецов, А.И. Добрососедство и европейская политика соседства – в чем различие? / А.И. Кузнецов // Балтийский регион. – 2009. – № 2. – С. 76–87.


## РОЛЯ РАСІЙСКІХ ГІСТОРЫКАЎ У РАЗВІЦЦІ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ВІЦЕБСКІМ ПЕДІНСТЫТУЦЕ (1920–1930-я гг.)


*А.М. Дулаў, Дз.В. Юрчак*
*Віцебск, УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”*


У 2011 г. спаўняецца дзесяць гадоў з моманту аднаўлення гістарычнага факультэта ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава. Вытокі гісторыі факультэта сягаюць у першую чвэрць ХХ ст. Яшчэ ў створаным ў 1918 г. на базе настаўніцкага педагагічным інстытуце вялася падрыхтоўка студэнтаў па сацыяльна-гістарычным цыкле. На жаль, падрыхтоўцы ў Віцебску гісторыкаў з вышэйшай адукацыяй у канцы 1910-х – 1930-я гг. даследчыкамі ўдзялалася недастаткова ўвагі. Выключэннем з’яўляюцца фактычна толькі працы Л.А. Маторавай [1]. У той жа час, акрэслены перыяд уяўляе значную цікавасць, у тым ліку, зыходзячы з высокага прафесійнага ўзроўню прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта. Аўтары паставілі мэту прасачыць ўплыў на развіццё гістарычнай адукацыі ў Віцебскім педінстытуце расійскай гістарычнай думкі і яе прадстаўнікоў на персанальным ўзроўні.

**Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі для падрыхтоўкі дадзенага артыкула паслужылі лісты студэнта гістарычнага факультэта ВДПІ імя С.М. Кірава 1938–1941 гг. Г.С. Еўдакіменкі намесніку дэкана гістарычнага факультэта ВДУ Дз.В. Юрчаку [2; 3]. Аўтары скарысталі інфармацыю энцыклапедычных даведнікаў, юбілейнага выдання, прысвечанага стогадоваму юбілею ўніверсітэта [4], а таксама працы папярэднікаў (Л.А. Маторавай, З. Шыбекі, А.Г. Лісава і А.М. Падліпскага) [1; 5; 6]. Метадалагічнай асновай даследавання паслужылі прынцыпы гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці. Былі выкарыстаны агульналагічныя, агульнанавуковыя і спецыяльнагістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Неабходна згадаць, што Віцебск стаў першым горадам Беларусі дзе вялася падрыхтоўка гісторыкаў. У 1911 г. з ініцыятывы Віцебскай вучонай архіўнай камісіі тут пачало працу аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (МАІ), разлічанае на асоб з вышэйшай адукацыяй.



Репозиторий ВГУ

Выкладалі ў дадзенай установе вядомыя расійскія навукоўцы. У 1913 г. стаў працаваць на пасадзе прафесара МАІ буйнейшы даследчык Віцебшчыны *Аляксей Парфёнавіч Сапуноў* (1852–1924), які быў выпускніком Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта і вучнем выдатнага славіста прафесара У.І. Ламанскага. А.П. Сапуноў выкладаў у МАІ курс "Древности Северо-Западного края" [5, 189–190]. Гэта быў ці не першы прыклад выкладання айчыннай гісторыі ў навучальных установах Беларусі [4, 71].

А.П. Сапуноў быў у ліку выкладчыкаў, якія ў паслярэвалюцыйны час працавалі ў педінстытуце. Тут Аляксей Парфёнавіч чытаў курсы па беларускіх старажытнасцях і гісторыі Беларусі. У 1923–1924 гг. у Віцебскім педінстытуце выкладаў таксама буйны расійскі гісторык, прафесар *Павел Мікалаевіч Ардашаў* (1865 – не раней за 1924). Ён чытаў курс новай гісторыі. Ураджэнец Вяцкай губерні, выпускнік Маскоўскага ўніверсітэта, П.М. Ардашаў здабыў сабе славу даследаваннямі па гісторыі Францыі. Яго грунтоўныя працы, прысвечаныя правінцыйнай адміністрацыі ў Францыі напярэдадні рэвалюцыі, заснаваныя на аналізе дакументаў французскіх архіваў, былі абаронены ў якасці магісцерскай і доктарскай дысертацый, выйшлі ў Расіі, убачылі свет і ў перакладзе на французскую мову пад назвай "Les Intendants de province sous Louis XVI" (Paris, 1909). Прафесар быў аўтарам шэрага артыкулаў у "Энциклопедическом словаре Брокгауза и Ефрона". У канцы XIX – пачатку XX ст. выкладаў у некалькіх расійскіх універсітэтах (Санкт-Пецярбургскім, Новарасійскім, Юр'еўскім, Кіеўскім). Як успамінаў адзін са студэнтаў, якому давялося слухаць лекцыі прафесара П.М. Ардашава на пачатку XX ст., "Мне всегда представлялось, что я слушаю французского ученого. Всегда и везде блестящим, увлекательным изложением своих лекций отличалась именно французская профессура... И во всех других отношениях профессор Ардашев напоминает мне ... скорее француза, чем вятича". Трэба думаць, з гадамі Павел Мікалаевіч не згубіў сваіх здольнасцяў, і не горшыя лекцыі чулі віцебскія студэнты.

У перыяд да 1924 г., калі педінстытут быў аб'яднаны з БДУ, у ім выкладалі і прадстаўнікі маладога пакалення гісторыкаў, у прыватнасці *Валерыян Адольфавіч Вейгер-Рэйдэмейсцер* (1888–1938). Валерыян Адольфавіч быў ураджэнцам г. Віцебска (паходзіў з вядомай аптэкарскай сям'і) і гадаванцам той жа alma mater, што і А.П. Сапуноў. У педінстытуце ён выкладаў гісторыю культуры. Найбольшы ўплыў на фарміраванне В.А. Вейгер-Рэйдэмейсцера як навукоўца аказаў выдатны расійскі гісторык, спецыяліст у галіне крыніцазнаўства і метадалогіі гісторыі *Аляксандр Сяргеевіч Лапо-Данілеўскі* (1863–1919), погляды якога ў многім апярэджвалі свой час. Ужо сам факт, што Вейгер-Рэйдэмейсцер з семестра ў семестр запісваўся для наведвання заняткаў А.С. Лапо-Данілеўскага вельмі паказальны: па ўспамінах сучаснікаў лекцыі Аляксандра Сяргеевіча былі цяжкімі для ўспрыняцця, не давалі гатовых высноваў, а запрашалі студэнтаў думаць і разважаць над складанымі праблемамі. Лёс В.А. Вейгер-Рэйдэмейсцера склаўся трагічна. У канцы 1930-х гг. ён быў рэпрэсаваны [гл. 6].

Пасля аб'яднання педінстытута з БДУ, аднаўленне яго, а разам з тым і адраджэнне вышэйшай гістарычнай адукацыі ў Віцебску, адбылося ў 1930-я гг. У 1933 г. Віцебскі індустрыяльна-педагагічны інстытут (дзейнічаў з 1930 г.) быў пераведзены на 4-гадовы тэрмін навучання і дапоўнены гістарычным факультэтам. У 1935 г. пры Віцебскім педінстытуце быў адкрыты настаўніцкі інстытут з двухгадовым тэрмінам навучання, які спачатку меў адно аддзяленне гістарычнае (у 1937 г. рэарганізавана ў гісторыка-філалагічнае) [4, 12]. Інстытут рыхтаваў настаўнікаў для сямігодак. У ім працавалі тыя ж выкладчыкі, што і ў педагагічным інстытуце.

Рэпазіторый ВДУ

Адной з цікавейшых асоб сярод выкладчыкаў ВДПІ імя С.М. Кірава у другой палове 1930-х – пачатку 1950-х гг. быў кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі СССР *Мікалай Васільевіч Кочатаў* (1906 – ?). М.В. Кочатаў нарадзіўся ў вёсцы непадалёк ад Ніжняга Ноўгарада, скончыў Горкаўскі педінстытут і аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У.І. Леніна. У 1938 г. быў накіраваны на працу ў ВДПІ імя С.М. Кірава, а 31 снежня таго ж года пад кіраўніцтвам прафесара *Канстанціна Васільевіча Базілевіча* (1892–1950) абараніў кандыдацкую дысертацыю "Аграрно-крестьянская политика помещиков России второй половины XVIII в. в отражении трудов Вольного экономического общества". М.В. Кочатаў чытаў курс гісторыі СССР са старажытных часоў да капіталізму. Як паказвае аналіз пасляваенных дакументаў, Мікалай Васільевіч адстойваў тэорыю каланізацыі славянамі ўсходнееўрапейскай раўніны, прызнаваў ролю асобы ў гісторыі, значную ўвагу надаваў "польско-литовскому периоду истории БССР" [гл. 7]. Можна меркаваць, што падобныя трактоўкі і падыходы былі ўласцівыя для заняткаў М.В. Кочатава па гісторыі СССР і ў даваенны час.

Відавочна, паўплываў на М.В. Кочатава як навукоўца і выкладчыка менавіта прафесар К.В. Базілевіч, прызнаным спецыяліст у галіне знешняй палітыкі расійскай дзяржавы ў другой палове XV ст., які значную ўвагу ўдзяляў узаемаадносінам Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім. К.В. Базілевіч стаў адным з аўтараў першага савецкага падручніка па гісторыі СССР для вну (1939), а таксама для сярэдняй школы (1940). Верагодна, па першым з названых падручнікаў вучыліся і студэнты Віцебскага педінстытута ў апошнія гады перад вайной.

Акрамя таго, у канцы 1930-х гг. на гістфаку ВДПІ імя С.М. Кірава выкладалі буйнейшыя савецкія гісторыкі. Так, паводле звестак, што паведаміў тагачасны студэнт, у далейшым кандыдат гістарычных навук, дацэнт Георгій Савіч Еўдакіменка, у канцы 1930-х гг. для чытання спецкурсаў у ВДПІ прыязджалі прафесар *Сяргей Уладзіміравіч Бахрушын* (1882–1950) і акадэмік *Яўген Віктаравіч Тарле* (1874–1955) [2, арк. 4]. Першы з іх чытаў курс па гісторыі Сібіры (адна з галоўных сфер навуковых інтарэсаў С.У. Бахрушына). Г.С. Еўдакіменка характарызаваў яго манеру выкладання наступным чынам: "Читал лекции свободно, без всяких конспектов. Приходил, становился за трибуну, здоровался, затем устремлял свой взор в верхнюю часть ближайшего окна и очень живо излагал материал. Иногда только на аудиторию бросал беглый взгляд. Слушать его было очень легко. И конспектировать тоже" [3, арк. 3].

Я.В. Тарле чытаў, відавочна, курс па гісторыі вайны 1812 г., бо, па ўспамінах Г.С. Еўдакіменкі, значную ўвагу надаваў ваенным дзеянням супраць напалеонаўскага войска на тэрыторыі Беларусі. Лекцыі яго не былі такімі яскравымі, як у С.У. Бахрушына, але матэрыял выкладаўся даступна і зручна для канспектавання. "И нас он сразу успокоил, заявив, что в библиотеках есть изданные им книги о Наполеоне и об Отечественной войне 1812 г." [3, арк. 3]. Можна ўявіць, які ўплыў мелі лекцыі буйнейшых навукоўцаў на віцебскіх студэнтаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, ля вытокаў вышэйшай гістарычнай адукацыі ў Віцебску стаялі прадстаўнікі расійскіх гістарычных школ, вядучыя навукоўцы, якія стала працавалі ў Віцебску або прыязджалі для чытання лекцый, і іх вучні. Такая сітуацыя была натуральнай з прычыны адсутнасці вну ў дарэвалюцыйнай Беларусі. Аднак першы перыяд падрыхтоўкі настаўнікаў гісторыі ў Віцебску быў вельмі кароткі (1918–1924 гг.). У 1930-я гг. у адноўленым ВДПІ зноў пачалося развіццё гістарычнай адукацыі, аднак гэты працэс быў перапынены Вялікай Айчыннай вайной.



Репозиторий ВГУ

1. Моторова, Л.А. Подготовка учителей-историков в Витебском педагогическом институте (1918–1924 гг.) / Л.А. Моторова, О.П. Шидловская // Веснік ВДУ. – 1998. – № 3. – С. 40–44.
2. Ліст Г.С. Еўдакіменкі Дз.В. Юрчаку ад 15.03.2011 г. // Асабісты архіў аўтара.
3. Ліст Г.С. Еўдакіменкі Дз.В. Юрчаку ад 05.04.2011 г. // Асабісты архіў аўтара.
4. Витебский государственный университет имени П.М. Машерова (1910–2010) / под ред. А.П. Солодкова. – Витебск, 2010.
5. Шибеко, З. Из истории Витебских археологических «курсов» / З. Шибеко // Неман. – 1980. – № 6. – С. 188–190.
6. Лисов, А.Г. Историк В.А. Вейгер-Рейдемейстер / А.Г. Лисов, А.М. Подлипский. – Витебск, 2004.
7. Дулаў, А.М. Асобы ў часе: загадчыкі кафедры гісторыі СССР ВДПІ імя С.М. Кірава ў 1944–1955 гг. / А.М. Дулаў, Дз. В. Юрчак // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф., Віцебск, 30–31 сакавіка 2010 г. / Віц. дзярж. ун-т; рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2010. – С. 166–171.

## СПЕЦИФИКА ПОГРАНИЧНОЙ СИТУАЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ ПСКОВСКОГО КРАЯ В 1920–1930-е ГОДЫ

*А.М. Егоров*
*Псков, Псковский юридический институт ФСИН России*

Укрепление государственных рубежей является неотъемлемой частью политики национальной безопасности любой страны. В этом смысле исключительно большой интерес, как для историков, так и для специалистов-практиков в области правоохранительной деятельности представляют события, происходившие в 1920-30-е гг. на северо-западе России и, в частности, на псковском участке советской границы. Актуальность данной проблемы объясняется воссозданием в современных условиях псковского участка государственной границы, что способствовало, в свою очередь, постановкой специфических проблем, характерных для жизнедеятельности любого пограничного региона.

Чрезвычайные социальные потрясения, распад империи и негативные последствия жестокого гражданского конфликта негативно отразились на переговорах о территориальном размежевании между Советской Россией и новыми прибалтийскими республиками. Перемещение государственного рубежа на территорию Псковщины неизбежно сопровождалось возникновением традиционных для пограничного региона проблем, одной из которых является контрабандизм. Однако его масштабы на Северо-Западе в начале 1920-х годов прошлого века придали этому явлению небывало острый характер и чрезвычайный политический резонанс.

Указанный период характеризовался тяжелым социально-экономическим положением страны, что серьезно подрывало престиж государственной власти в наиболее затронутых разрухой районах. Упадок промышленности и сельского хозяйства в результате первой мировой и гражданской войн, рост цен и безработица, острый товарный дефицит и огромные очереди за элементарными предметами первой необходимости порождали спекуляцию и стимулировали рост преступности. Материальные затруднения населения способствовали развитию «черного рынка» и контрабандной торговли, которая в пограничных районах превращалась в устойчивый криминальный бизнес [1].

Репозиторий ВГУ